www.gazeta.bsu.by

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

11 лютага 2005 года, № 3 (1911)

ПАДЗЕІ

ДЗЕНЬ НАВУКІ — У СЦЕНАХ БДУ

Галоўнае мерапрыемства, прысвечанае святкаванню Дня беларускай навукі, адбылося ў БДУ.

Рэспубліканскі сход навуковай грамадскасці адбыўся 27 студзеня ў ліцэі БДУ. Адкрыў сход сваім уступным словам прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь, старшыня аргкамітэта па правядзенні святочных мерапрыемстваў С.С. Сідорскі. З дакладам "Роля навукі ў сацыяльна-эканамічным развіцці рэспублікі" выступіў міністр адукацыі А.М. Радзькоў. Да Дня навукі навукоўцы і вядучыя спецыялісты БДУ атрымалі ўзнагароды. Ганаровай граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь узнагароджаны загадчык кафедры тэарэтычнай і прыкладной механікі механіка-матэматычнага факультэта БДУ, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар Міхаіл Анатольевіч Жураўкоў; дырэктар Навукова-вытворчага рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Актыў БДУ", кандыдат фізіка-матэматычных навук Валерый Васільевіч Хадасевіч; дацэнт кафедры інфарматыкі факультэта радыёфізікі і электронікі БДУ, кандыдат тэхнічных навук, старшы навуковы супрацоўнік Валерый Анатольевіч Чудоўскі; прафесар кафедры сацыялогіі факультэта філасофіі і сацыяльных навук БДУ, доктар сацыялагічных навук Ларыса Рыгораўна Цітарэнка. Ганаровай граматай Акадэміі навук узнагароджаны дэкан фізічнага факультэта, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар Валерый Васільевіч Анішчык. Акрамя таго быў падпісаны загад рэктара нашага універсітэта Васіля Іванавіча Стражава аб узнагароджанні Ганаровай граматай і прэміраванні 10 супрацоўнікаў кафедраў факультэтаў БДУ, а таксама 14 супрацоўнікаў навуковых падраздзяленняў, якія маюць статус юрыдычнай асобы.

У рамках святочных мерапрыемстваў працавалі выставы навукова-тэхнічных дасягненняў, вынікаў інавацыйнай дзейнасці навукоўцаў і спецыялістаў. Адбылося абнаўленне экспазіцый пастаяннай выставы навукова-тэхнічнай прадукцыі БДУ. На ёй была прадстаўлена інфармацыя і прадукты малатанажнай хіміі, медыцынскай дыягностыкі і рэагенты, СВЧ-кампаненты і г. д. Абноўлены дэманстрацыйныя матэрыялы па апаратна-праграмных комплексах, хімічных тэхналогіях, абсталяванні для вытворчасці пенаполіурэтанаў і нанясення аднакампанентных поліурэтанавых клеяў ІКПУ-250. Дарэчы, у мінулым годзе ў БДУ з'явілася больш за 40 новых распрацовак. Наш універсітэт не толькі стварае, але і паспяхова рэалізуе сваю навукова-тэхнічную прадукцыю. За 2004 год заключана кантрактаў на суму звыш 4 мільёнаў долараў.

Ганна АНАТОЛЬЕВА
Фотаздымак Генадзя КРАСКОЎСКАГА

АДЗНАЧАНЫ ЗА ДАСЯГНЕННІ Ў НАВУЦЫ

Пра свой уклад у развіццё навуковых даследаванняў, укараненне іх у прамысловасць і навучальны працэс, падрыхтоўку навуковых кадраў расказваюць навукоўцы, якія атрымалі ганаровыя граматы ад Міністэрства адукацыі і Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Віктар Міхайлавіч АНІШЧЫК, дэкан фізічнага факультэта, доктар фізіка-матэматычных навук, заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь:

— У Ганаровай грамаце Акадэміі навук, якую я атрымаў, была адзначана мая навуковая і інавацыйная дзейнасць, актыўны ўдзел у фарміраванні і рэалізацыі дзяржаўных навуковых і навукова-тэхнічных праграм. Я ўпэўнены, што гэтым быў адзначаны ўклад у навуку ўсяго фізічнага факультэта. Самая значная праца, праведзеная фізічным факультэтам, — гэта выкананне галіновай праграмы па распрацоўцы лабараторнага практыкуму па курсе агульнай фізікі для універсітэтаў краіны. 60 такіх работ устаноўлены ў БДУ. Сёння працуем над стварэннем такіх комплексаў для іншых ВНУ краіны.

Валерый Анатольевіч ЧУДОЎСКІ, дацэнт кафедры інфарматыкі факультэта радыёфізікі і электронікі БДУ, кандыдат тэхнічных навук, старшы навуковы супрацоўнік:

— Думаю, што прычынай майго ўзнагароджання Ганаровай граматай Міністэрства адукацыі стала ўкараненне ў серыйную вытворчасць шэрага сучасных вымяральнікаў, створаных пад маім кіраўніцтвам. Комплекс УПІ-ПРО, які выпускаецца на УП "Унітэхпрам БДУ", дзе я з'яўляюся дырэктарам навукова-вытворчага цэнтра "Інфармацыйна-вымяральныя сістэмы", унесены ў Рэестр сродкаў вымярэння Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі і выйграў конкурс "Лепшы тавар Рэспублікі Беларусь 2002 года". Гэты комплекс шматфункцыянальны і можа замяніць 8 тысяч звычайных вымяральных прыбораў. Мне вельмі прыемна, што гэтую працу заўважыла менавіта Міністэрства адукацыі, у сістэме якога я адпрацаваў 30 гадоў.

Ларыса Рыгораўна ЦІТАРЭНКА, прафесар кафедры сацыялогіі факультэта філасофіі і сацыяльных навук БДУ, доктар сацыялагічных навук:

— Думаю, Міністэрства адукацыі, адзначыўшы мяне Ганаровай граматай, заўважыла тое, што ўвосень гэтага навучальнага года абараніліся ў тэрмін дзве мае аспірантак. Вы ведаеце, што абаранщца ў тэрмін для многіх аношнім часам — сапраўдная праблема. Работа з аспірантамі — гэта педагагічная, навуковая, маральная нагрузка. І я аддаю ей шмат часу. Пры гэтым сама вяду навуковую працу. У мінулым годзе выйшла мая манаграфія "Кантоўнасны свет сучаснага беларускага грамадства. Гендэрны падыход". Часта прадстаўляю беларускую навуку на міжнароднай арэне. У гэтым годзе, напрыклад, паеду ў Швецыю (Стакгольм), дзе буду весці пяць навуковых секцый.

Валерый Васільевіч ХАДАСЕВІЧ, дырэктар Навукова-вытворчага рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Актыў БДУ", кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт:

— Упэўнены, што Міністэрства адукацыі, узнагародзіўшы мяне Ганаровай граматай, улічыла, што прадпрыемства "Актыў БДУ", якое я ўзначальваю, выпускае добрую вакуумную тэхніку, распрацоўвае тэхналогіі нанясення вакуумна-плазменных пакрыццяў. Другі кірунак, над якім мы працуем, — распрацоўка новых тэхналогій кармлення жывёл, а таксама падкормкі раслін. Аношнім часам на нашым прадпрыемстве наладжаны выпуск лабараторных работ па курсе агульнай фізікі, якія былі распрацаваны на фізічным факультэце нашага універсітэта.

Міхаіл Анатольевіч ЖУРАЎКОЎ, загадчык кафедры тэарэтычнай і прыкладной механікі механіка-матэматычнага факультэта БДУ, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар:

— Ганаровая грамата Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь была мне ўручана за навуковую і навукова-педагагічную працу ў 2004 годзе.

На кафедры тэарэтычнай і прыкладной механікі механіка-матэматычнага факультэта, якую я ўзначальваю, шмат робіцца для ўдасканалення навучальнага працэсу. У гэтым годзе мы збіраемся ўвесці новую спецыялізацыю — камп'ютарная механіка, а таксама ўдасканаліць навучанне па тых, якія ўжо існуюць — тэорыя пругкасці і трываласці, сістэма аўтаматызаванага праектавання і робататэхніка ў механіцы. На кафедры з'явілася шмат новых спецкурсаў, камп'ютарных класаў. Лекцыі чытаюцца з дапамогай аудыёвізуальнай тэхнікі. Кафедра тэарэтычнай і прыкладной механікі ў мінулым годзе заключыла ажно 17 гаспадарчых дагавораў на навуковыя распрацоўкі з прадпрыемствамі Беларусі і Расіі. Да іх рэалізацыі прыцягваюцца і студэнты.

Ганна ЛАГУН

Фотаздымак Генадзя КРАСКОЎСКАГА

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

ЗАПЛАЦІ, КАБ ЗЭКАНОМІЦЬ

Матэрыял пра платныя паслугі Фундаментальнай бібліятэкі

Стар. 2

ЛІЦЭЮ БДУ — 15 ГАДОЎ!

Гутаркі з дырэктарам ліцэя, настаўнікам і ліцэістам падрыхтавалі самі навучэнцы ліцэя БДУ

Стар. 3

СПАРТАКІЯДА Ў "БРЫГАНЦІНЕ"

Першае месца заняла кафедра фізічнага выхавання і спорту

Стар. 4

У ПАВЕТРЫ ПАНУЕ КАХАННЕ

14 лютага — Дзень святога Валянціна

Стар. 4

АБ'ЯВЫ

АБАРОНА ДОКТАРСКІХ ДЫСЕРТАЦЫЙ

17 лютага 2005 года ў 14.00 у аўд. 319 фізічнага факультэта БДУ адбудзецца абарона дысертацый:

КАПЛЕЎСКАГА Кірыла Мікалаевіча, асістэнта кафедры лазернай фізікі і спектраскапіі БДУ, па тэме **"Сіметрычныя індатрыкарбацыянінавыя фарбавальнікі ў растворах і біялагічных структурах: іонныя раўнавагі, фатоніка, фотацыятаксічнасць"** на суіскание вучонай ступені доктара фізіка-матэматычных навук. Навуковы кансультант — доктар фізіка-матэматычных навук, вядучы навуковы супрацоўнік САМЦОЎ Міхаіл Пятровіч;

ЧАРВЯКОЎСКАГА Кліменція Іванавіча, малодшага навуковага супрацоўніка УП "Унікаштмет" БДУ, па тэме **"Працэсы паступлення рэчываў у плазму дугавога разраду пры атамна-эмісійным аналізе ўзораў золата і серабра малой масы"** на суіскание вучонай ступені доктара фізіка-матэматычных навук. Навуковы кансультант — доктар фізіка-матэматычных навук, дацэнт ЗАЖОГІН Анатоль Паўлавіч.

16 лютага 2005 года ў 14.00 у аўд. 334 галоўнага корпуса БДУ адбудзецца абарона дысертацыі:

ГАШЧАНКІ Леаніда Аляксеевіча, дацэнта кафедры філасофіі Віцебскага дзяржаўнага універсітэта, па тэме **"Метадалагічныя асновы патрыятычнай сацыялізацыі студэнцтва"** на суіскание вучонай ступені доктара сацыялагічных навук. Навуковы кансультант — доктар сацыялагічных навук, прафесар РОТМАН Давід Генрыхавіч.

Паводле інфармацыі Упраўлення падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі (тэл. 209-51-68)

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

НАВУЧАННЕ Ў ШВЕЦЫІ

8 лютага ў БДУ адбыўся інфармацыйны семінар, дзе Шведскім інстытутам і аддзяленнем пасольства Швецыі ў Мінску была прадстаўлена праграма "ВІСБІ" для маладых даследчыкаў і студэнтаў, якія жадаюць навучацца ў Швецыі. У межах гэтай праграмы ўрад Швецыі дае магчымасць атрымаць стыпендыі беларускім студэнтам і аспірантам для навучання ў ВНУ Швецыі ў 2005/2006 акадэмічным годзе. Мовы навучання — шведская і англійская. Апошні тэрмін падачы заявак — 1 сакавіка 2005 года.

Больш падрабязную інфармацыю пра праграму можна атрымаць на старонцы Шведскага інстытута: www.studyinsweden.se.

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

ЗАПЛАЦІ, КАБ ЗЭКАНОМІЦЬ

Нагодай для студэнцкага незадавальнення стала вестка, што ўсю атрыманую літаратуру трэба вярнуць у бібліятэку (альбо працягнуць тэрмін карыстання, калі гэта неабходна) да 1 лютага — інакш за кожны пратэрмінаваны дзень давядзецца заплаціць па 60 руб. за кнігу. З просьбай патлумачыць сітуацыю мы звярнуліся да загадчыцы аддзела бібліятэчнага маркетынгу Фундаментальнай бібліятэкі БДУ Галіны Васільеўны МАРКАВАЙ.

Платныя бібліятэчна-інфармацыйныя паслугі з'явіліся ў Фундаментальнай бібліятэцы БДУ з 1 студзеня 2004 г. Прэйскурант ёсць ва ўсіх аддзелах абслугоўвання і на сайце бібліятэкі ў Інтэрнэце.

Сярод навінак працы бібліятэкі тое, што цяпер можна браць кнігі з чытальнай залы. Прычым за грошы карыстацца фондам бібліятэкі могуць таксама студэнты і супрацоўнікі іншых ВНУ Беларусі.

Платныя паслугі для бібліятэкара становяцца значна большай праблемай, чым для чытача. Менавіта бібліятэкару даводзіцца прымаць дадатковую нагрузку: працаваць з касавым апаратам, афармляць заяўкі, рабіць копіі для карыстальнікаў. Пры гэтым платныя паслугі выкарыстоўваюцца ў дадатак да асноўных.

Гадавы досвед існавання платных паслуг паказаў, што ўвялі іх не дарэмна. Дзякуючы зароблены матэрыяльным сродкам удалося нямат чаго набыць — ад элементарнай паперы і канцтавараў і заканчваючы дакамплектаваннем фонду (мабыць, кожнаму з нас даводзілася сутыкацца з праблемай недастатковай колькасці экземпляраў патрэбнай кнігі). На гэтыя ж грошы ўдалося да-

купіць касавыя апараты (тры з іх былі набытыя на грошы з універсітэцкага бюджэту — для галоўнага корпуса, філалагічнага факультэта і бібліятэкі біялагічнага і радыёфізічнага факультэтаў). Новыя апараты патрапілі на факультэты журналістыкі, міжнародных адносін і геаграфічны. Зроблена гэта ў 60 % даўжнікоў з факультэта радыёфізікі і электронікі і біялагічнага факультэта вярнулі літаратуру. Здадзенымі падручнікамі бібліятэка змагла забяспечыць студэнтаў завочнага аддзялення.

Што ж тычыцца платнай паслугі за ксеракопію, дык на некаторых факультэтах яна... бясплатная — напрыклад, на геаграфічным. Чаму? А таму, што дэкан факультэта І.І. Пірожнік прыняў рашэнне перадаць у чытальную залу перыядычных выданняў геафака ксеракс. І студэнты задаволеныя, і бібліятэкары: студэнтам не даводзіцца плаціць за вынас кнігі на ксеракопію, а бібліятэка пазбегла лішніх выдаткаў, бо купіць ксеракс ёй было б дорага. На жаль, бібліятэка не можа паставіць ксераксы ва ўсе чытальныя залы, а неабходнасць гэтага відавочная.

Дарэчы, паколькі студэнцкіх скаргаў: некаторыя з платных паслуг прапануюць менавіта студэнты. Так, падчас анкетавання сярод студэнтаў філалагічнага факультэта было прапанавана зрабіць такую паслугу, як сканіраванне матэрыялаў з фонду бібліятэкі. Яшчэ адна паслуга, прапанаваная студэнтамі, — платная замова таго ці іншага выдання праз тэлефон. Мяркую, большасць з нас ахвотней аддасць 300 руб. за такую паслугу, чым будзе двойчы стаяць у чарзе (спачатку каб замовіць патрэбную кнігу, а потым — каб яе ўзяць). На жаль, пакуль такая паслуга ёсць толькі ў адзеле абслугоўвання філалагічнай і філасофска-эканамічнай літаратурай. Як бачна, платныя паслугі дазваляюць нам эканоміць час, берагчы нервы, пазбаўляцца ад лішніх клопатаў.

Праўда, эканамічныя рычагі — пакуль адзіны спосаб уплыву на несвядомых карыстальнікаў бібліятэкі. Штогод ім дасылаюць некалькі тысячаў пісьмоў-напамінаў з просьбай здаць кнігі ў бібліятэку. Маральны ўплыў не даваў належнага эфекту, таму адзіным варыянтам стаў эканамічны. Сёлета бібліятэка выслала каля 2000 напамінаў, якія нагадвалі не пра сумленне, а пра адказнасць: аб тэрміне здачы (1 лютага 2005 г.) паведамілі яшчэ да пачатку зімы, так што часу ў даўжнікоў было дастаткова.

Відавочна, што з увядзеннем платных паслуг бібліятэка звязвае надзеі на паляпшэнне тэхнічнай аснашчанасці свайго комплексу. Падумайце самі. Наколькі б павысілася эфектыўнасць яе працы, калі б кожная чытальная зала мела камп'ютар з доступам у Інтэрнэт, прынтэр, сканер, ксеракс... Вядома, платныя паслугі — толькі кропля ў моры, але гэта, прынамсі, крок у патрэбным кірунку.

Ала МАЧАЛАВА,
студэнтка
факультэта журналістыкі

Фотаздымкі Юліі ПАПОВАЙ

ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

ПЕРШАЯ СЕСІЯ

Першая ў жыцці першакурснікаў зімовая сесія вымагала вялікай адказнасці. Як яны здалі яе? З гэтым пытаннем "Беларускі універсітэт" звярнуўся і да "лірыкаў", і да "фізікаў".

Намеснік дэкана гістарычнага факультэта Юрый Леанідавіч Казакоў адзначыў, што паспяховасць першакурснікаў крыху знізілася ў параўнанні з мінулымі гадамі: на аддзяленні гісторыі беларускамоўная плынь мае паспяховасць 86 % (7 студэнтаў з нездавальняючымі адзнакамі), рускамоўная — 86 % (5 студэнтаў з нездавальняючымі адзнакамі), на аддзяленні музейнай справы і аховы помнікаў гісторыі паспяховасць увогуле склала 68 %. Ю.Л. Казакоў тлумачыць зніжэнне паспяховасці вялікай колькасцю платнікаў, якую сёлета набралі на факультэт. Разам з тым, апраўдалі свае высокія веды ліцэісты БДУ (паспяховасць 100 %), пераможцы алімпіядаў (93 %), медалісты (96 %).

Намеснік дэкана факультэта радыёфізікі і электронікі Сяргей Уладзіміравіч Малы ацэньвае вынікі сесіі на сваім факультэце больш аптымістычна. "У нас на ўсіх курсах паспяховасць захавалася практычна такая ж, як і ў ранейшыя гады". Першы курс выглядае нават лепшым за сваіх папярэднікаў: колькасць тых, хто здаў сесію на "выдатна" альбо на "добра" і "выдатна", крыху вырасла. "У нас упершыню за апошнія 5 гадоў група тых, хто здае на "добра" і "выдатна", перавысіла групу са змешанымі адзнакамі", — кажа С.У. Малы. Сяргей Уладзіміравіч звязвае гэта з тым, што тэставая сістэма паступлення прымусіла абітурыентаў рыхтавацца над час уступных экзаменаў не толькі да іспытаў па фізіцы і мове, але і па матэматыцы. Раней праблемы ў студэнтаў на першай сесіі ўзнікалі якраз з гэтым прадметам. "У нас селета зменшылася колькасць студэнтаў-алімпіяднікаў, але гэта не адбілася на паспяховасці", — адзначае С.У. Малы. Аднак ён усё ж шкадуе, што алімпіяда "Абітурыент БДУ" перастае быць інструментам набору студэнтаў.

Іван ФЕДАРОВІЧ

ЗНАЁМСТВА З ПРАФЕСІЯЙ

Унікальную магчымасць пазнаёміцца з "закуліснай" працай журналістаў атрымалі выхаванцы гуртка журналістыкі Цэнтра пазашкольнай работы Маскоўскага раёна "Ранак" разам са сваёй кіраўніцай Наталляй Арлоўскай яны наведалі з экскурсіяй факультэт журналістыкі БДУ. У фоталабараторыі яны ўбачылі працэс стварэння лічбавых фотаздымкаў. У радыестудыі факультэта самыя смелыя пад кіраўніцтвам нажыпера Алега Шолеста паспрабавалі сябе ў ролі ды-джэяў, уявіўшы сябе ў якасці вядучых папулярнай FM-станцыі. У відэамантажнай кожны мог адчуць сябе тэлеаператарам і зняць невялікі відэасюжэт, над якім потым працаваў загадчык лабараторыі аўдыёвізуальных тэхналогій Андрэй Падтачэй, дэманструючы магчымасці сучаснай камп'ютарнай тэхнікі. У камп'ютарным класе юныя экскурсанты назіралі за працэсам стварэння анімацыйных роліка. Таксама на пытанні будучых абітурыентаў адказала намеснік дэкана па творчым супрацоўніцтве са СМІ Т.І. Прановіч.

Марыя КАВАЛЁВА

ЮБІЛЕІ

Да 15-годдзя ліцэя БДУ

ГАРМОНІЯ

Гэта ўжо не школа, але яшчэ і не універсітэт. Гэта месца, дзе ў самых сценах закладзена арганічнае спалучэнне навуковай дасведчанасці і яскравага, бліскучага і невычэрпна шматграннага жыцця, спалучэнне тэрміналогіі, тэарэтычных заўваг і лірычных адхіленняў. На святочных канцэртах, калі збіраецца поўная зала ліцэістаў (ліцэістаў афіцыйных і ліцэістаў у душы — выпускнікоў), ананоўвае чароўнае пачуццё нейкай таямніцы... Нездарма гавораць пра «дух ліцэя»!

Ліцэйскія дні — гэта час, які ніколі не забудзецца. Пад час навучання ўзнікае тая гармонія, калі шчырасць эмоцый спалучаецца з выключнай патрабавальнасцю да сябе, імкненнем да дасканаласці.

Марыя ГРУДЗЬКО

ЭЛІКСІР МАЛАДОСЦІ

Наша суразмоўца — дырэктар ліцэя БДУ Таццяна Аляксандраўна КАЛЕВІЧ. Дырэктарскую пасаду займае нядаўна, але для ліцэя яна чалавек не новы: яе добра ведаюць як выкладчыцу хіміі і цікавую энергічную асобу.

Таму першае пытанне для Таццяны Аляксандраўны: як яна адчувае сябе ў новай ролі?

— З аднаго боку, гэта вельмі вялікая адказнасць, якая заўседы прымушае трымацца ў пэўных межах. З другога — пачуццё гонару за тое, што мне даверыў наш ліцэй. Зараз я, па сутнасці, капітан нашага карабля.

— Ці змяніліся ліцэісты за час Вашай працы тут?

— Калі параўноўваеш першых выхаванцаў і цяперашніх, то адрозненняў шмат. Можа, нашы першыя навучэнцы былі больш сталымі. Асэнсаванне ж ліцэя не змяняецца: ніякіх іншых пачуццяў, акрамя сяброўства, агульнага духу, супрацоўніцтва, за ўвесь гэты час не было.

— Ліцэю споўнілася 15 гадоў — пераходны ўзрост для чалавека. Ці знаходзіцца ліцэй на мяжы маладосці і сталасці?

— Раней ліцэй быў вынікам рэалізацыі незвычайнай ідэі, якая ўзнікла літаральна на пустым месцы. Але за 15 гадоў адбылася сур'ёзная эвалюцыя ідэі. Яна ўвасобілася ў нашым цудоўным будынку, цудоўным калектыве, у 3000 выпускнікоў. Сёння мы сталая арганізацыя.

— Ліцэй атрымаў шмат узнагарод, апошняя — прэмія Савета Міністраў у галіне якасці...

— Гэта заслуга папярэдняга дырэктара ліцэя Генадзя Уладзіміравіча Пальчыка. Сведчаннем высокага ўзроўню вядзення нашых ліцэістаў стала крышталь ная ваза, якая цяпер упрыгожвае ўваход у будынак.

— Здаецца, і самі ліцэісты прывозяць узнагароды з міжнародных алімпіяд.

— Больш за 100 навучэнцаў за гэтыя 15 год сталі пераможцамі міжнародных алімпіяд і больш за 600 перамаглі ў рэспубліканскіх.

— Як складваецца далейшы лёс ліцэістаў?

— Першым выпускнікам толькі споўнілася 30 гадоў, усяго ж скончыл універсітэты 10 пакаленняў ліцэістаў. Яны яшчэ вельмі маладыя людзі, і для дасягнення значных вынікаў гэты тэрмін недастатковы. Многія з ліцэістаў прыйшлі да нас педагогамі, і я вельмі ганаруся сваімі вучнямі — братамі Матулісамі, якіх вельмі паважаюць і любяць у ліцэі. За такімі маладымі спецыялістамі будучыня нашай краіны.

— Кажуць, што Вы і Ваш выхаванец удасканалілі табліцу Мендзялеева?

— Так, але не ўдасканалілі, а сістэматызавалі яе. Мой вучань Андрэй Кульша (сёння аспірант БДУ) звярнуўся да мяне: "Я вось трошкі перастаўіў элементы табліцы Мендзялеева". А сёння варыянт, прапанаваны Андрэем, ужо абмяркоўваецца ў сучаснай хімічнай літаратуры, і лічыцца найбольш навуковa карэктным. Гэтая таблiца ўжо вытрымала 4 выданні і нават прадаецца ў кіёскі хімічнай літаратуры Маскоўскага універсітэта.

— Як бы Вы вызначылі, што такое ліцэй на мове вашага прадмета — хіміі?

— Эліксір маладосці.

Капырына ОСІПЧЫК
і Марыя КАВАЛЁВА
Фота Каралiны КІСЕЛЬ

"ГЕНІЯ ВЫХАВАЦЬ НЕЛЬГА. І НЕ ТРЭБА!"

Ігар Мікалаевіч ВАРАКСА, выпускнік ліцэя 1995 года, у свае 26 год займае адказную пасаду намесніка дырэктара па навуковай працы. Менавіта ён рыхтуе пераможцаў міжнародных алімпіяд, на яго рахунку не адна ўзнагарода за вялікі ўклад у дзейнасць ліцэя.

— Уявіце сабе, што ліцэй — літаратурны твор. Кожны твор мае галоўную думку. Якая яна ў ліцэя?

— Самарэалізацыя дзяцей і настаўнікаў, бо тут ёсць шмат магчымасцей праявіць сябе.

— Ці змяніўся за 15 год светапогляд навучэнцаў?

— Ну, вось мы з вамі адрозніваемся: я ўжо ліцэіст са стажам, так? (Смяецца) Дзеці былі і ёсць разумныя, ды погляд на рэчы неяк змяніўся. Аднак адносны да вучобы заўседы аднолькавы: усё ў апошні дзень!

— Ці карэктуеце Вы ліцэістаў, і як?

— Канешне, але я за "гуманныя метады": кантрольную якую-небудзь ускладняю. Ліцэісты пяшмат шкодзяць. Яны вельмі сумленныя і адказныя дзеці.

— А Вас ліцэй чаму навучыў?

— Усяго не пералічыш! Ліцэй прадвызначыў мой лес: калі б я застаўся вучыцца ў сваёй школе, быў бы зараз якім-небудзь кіраўніком банка, але ж гэта нецікава. Ліцэй прымусіў мяне паверыць у свае сілы.

— Як Вы разумееце словы "быць вартым звання ліцэіста"?

— Пельга размаўляць аб нейкіх якасцях, якія ідэальны ліцэіст абавязкова павінен мець. Можна было б нафантазіраваць. Дрэнных людзей тут няма, іх няма ўвогуле. Проста дзеці зусім розныя, кожны па-свойму сябе паказвае: хтосьці больш любіць выступаць на сцэне разам з творчай групай, а хтосьці — у алімпіядах удзельнічаць.

— Ці можна з адоранага ліцэіста зрабіць генія?

— Геніямі не становяцца, імі нараджаюцца. Кожны год да нас прыходзяць вельмі таленавітыя дзеці, наша задача — развіць іх, дапамагчы раскрыцца. Генія нельга выхаваць. І не трэба!

— Калі б у Вас быў дарослы сын ці дачка, ці выправілі б іх вучыцца ў ліцэй?

— Канешне! Іншая справа — як паступіць: экзамены тут — не жарт. Але мне яшчэ шмат чаканць такога моманту.

Любоў КУРЫЛА
і Надзея БІНДОЎСКАЯ
Фота Надзеі БІНДОЎСКАЙ

БЛІЦ-АПЫТАННІ ДЛЯ ВЫКЛАДЧЫКА І ЛІЦЭІСТА

ЗВЫЧАЙНЫ ЛІЦЭІСТ З НЕЗВЫЧАЙНЫМІ ДУМКАМІ

Кірыл СЯНКЕВІЧ — вучань 11 класа гістарычнага профілю, таленавіты акцёр, цікавы і крэатыўны чалавек, ведае добра англійскую і нядрэнна польскую мовы, грае на баяне, фартэп'яна, кантрабас-балалайцы, гітары... Гуляе ў КВЗ (там даводзіцца і спяваць, і танцаваць, і стаяць на вушах). Як і ўсе, вучыўся ў школе, цікавіўся баскетболам, гуляў за зборную горада, потым паступіў у ліцэй БДУ... Тут ён заўсёды наперадзе і нават атрымаў Дыплом I ступені на Рэспубліканскай алімпіядзе па геаграфіі ў 2003 годзе.

— Што ў ліцэі прывабліве больш за ўсё?

— Не хочацца дадому пасля заняткаў ісці: тут непаўторная пазаўрочная атмасфера. Я разумею гэта, калі вяртаюся ў сваю былую школу і параўноўваю.

— Ці ёсць рэчы, якія б ты не стаў рабіць на сцэне?

— Я магу ўсё! Праўда, калі пачынаю танцаваць, то гэта ўжо КВЗ.

— Якая твая роля ў ліцэі?

— Я неафіцыйны сцэнавы ліцэя БДУ, гэзн. кірую актавай залай і засцэнкамі.

— Што-небудзь у нябе змянілася за 2 гады вучобы ў ліцэі БДУ?

— Я ўмацаваўся ў думцы, што хоць усе людзі і розныя, але па-свойму цікавыя. У ліцэі ёсць шмат асобаў, вельмі не падобных да іншых, і гэта цудоўна.

Дар'я МІСЬКЕВІЧ
і Лейла ІСМАІЛАВА
Фота Лейлы ІСМАІЛАВАЙ

ЛІЦЭЙ БДУ ЗАПРАШАЕ

У навучальна-адукацыйную ўстанову "Ліцэй БДУ" (далей ліцэй БДУ) маюць права паступлення навучэнцы, якія пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і атрымалі ў бягучым годзе агульную базавую адукацыю. Навучэнцы, якія паступілі ў ліцэй БДУ, працягваюць навучанне ў 10-м і 11-м класах на бюджэтнай аснове.

Навучэнцы, якія паступаюць у ліцэй БДУ, прадастаўляюць паступныя дакументы: даведку з фатаграфіяй, завераную школьнай пячаткай; заяву на імя дырэктара ліцэя БДУ вызначанага ўзору, квітанцыю аб уплаце арганізацыйнага ўзносу. Пераможцы заключнага этапа Рэспубліканскай алімпіяды бягучага года прадастаўляюць копіі дыпломаў.

Дакументы прымаюцца з **9 красавіка на 6 красавіка 2005 г.** уключна.

На час праходжання конкурснага адбору інтэрнат іншагароднім навучэнцам не прадастаўляецца.

У ліцэй БДУ прымаюцца навучэнцы на наступныя профілі навучання: фізіка (набор — 40 месцаў); матэматыка (60 месцаў); хімія (20 месцаў); біялогія (40 месцаў); руская і беларуская філалогія (40 месцаў); гісторыя (40 месцаў). Набор у ліцэй БДУ адбываецца на конкурснай аснове па выніках адкрытых рэспубліканскіх алімпіяд "Абітурыент ліцэя БДУ — 2005", якія праводзяцца 10 і 17 красавіка 2005 года (пісьмова).

На-за конкурсам могуць быць залічаныя:

пераможцы заключнага этапа Рэспубліканскай алімпіяды (дыпломы I, II і III ступені), якая праводзілася Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у бягучым навучальным годзе, на адпаведны профіль навучання;

пераможцы Рэспубліканскай алімпіяды па інфарматыцы (Дыплом I ступені), якія паступаюць у матэматычны клас.

Пераможцы Рэспубліканскай алімпіяды па прадметах, не адпаведных профілю навучання, удзельнічаюць у агульным конкурсе з атрыманнем дадатковых балаў у колькасці 10 % ад максімальнай сумы балаў па двух профільных прадметах.

Цалкам правілы прыёму размяшчаюцца на сайце ліцэя БДУ (www.lyceum.bsu.by).

Тэлефоны для даведак: 209-56-19, 209-56-14, 209-56-11, 209-56-02.

Адрас: г. Мінск, вул. Ульянаўская, 8.

Профіль навучання	*Першая алімпіяда (10 красавіка)*	*Другая алімпіяда (17 красавіка)*
Фізіка	Фізіка	Матэматыка
Матэматыка	Матэматыка	Фізіка
Хімія	Хімія	Матэматыка
Біялогія	Біялогія	Хімія
Руская і беларуская філалогія	Беларуская мова і літаратура	Руская мова і літаратура
Гісторыя	Сусветная гісторыя (пайноўшы час)	Гісторыя Беларусі

КАНФЕРЭНЦЫІ

АД ЭФЕКТЫЎНАГА ВЫКЛАДАННЯ ДА ЭФЕКТЫЎНАГА НАВУЧАННЯ

Цэнтр праблем развіцця адукацыі БДУ 24—25 сакавіка 2005 года праводзіць V Міжнародную навукова-практычную канферэнцыю "Універсітэцкая адукацыя: ад эфектыўнага выкладання да эфектыўнага навучання". Тэма канферэнцыі — "Самастойная работа і акадэмічныя поспехі. Тэорыя, даследаванні, практыка".

На выніках канферэнцыі плануецца выдаць зборнік артыкулаў. Матэрыялы артыкулаў разам з заяўкай на ўдзел у канферэнцыі прадастаўляюцца ў электронным і друкаваным выглядзе да 1 сакавіка 2005 г. Аб'ем артыкула не павінен перавышаць 6 друкаваных старонак, памер шрыфта 12, інтэрвал паўтарачны, палі — па 2 см з кожнага боку.

Аргкамітэт канферэнцыі пакідае за сабой права адбіраць заяўкі і не публікаваць матэрыялы, не адпаведныя тэматыцы канферэнцыі.

Для ўдзелу ў працы канферэнцыі неабходна выслаць на адрас аргкамітэта запоўненую заяўку. У заяўцы абавязкова павінна змяшчацца рэзюмэ (аспоўны тэзіс, які развіваецца ў артыкуле), артыкулы (да 1500 сімвалаў).

Усе заяўкі і прапановы дасылаць на адрас: ЦПРА БДУ, праспект Ф. Скарыны, 4, 220050, г. Мінск, і на e-mail: edc@bsu.by з пазнакай "Самастойная работа".

На ўсе пытанні, звязаныя з удзелам у канферэнцыі, можна звяртацца да арганізатараў канферэнцыі па тэлефоне 209-59-65 (Губарэвіч Дзмітрый, Кароль Дзмітрый).

АБ'ЯВЫ

ІНСТЫТУТ ТЭАЛОГІІ ІМЯ СВЯТЫХ МЯФОДЗІЯ І КІРЫЛЫ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

аб'яўляе набор на падрыхтоўчыя курсы па дысцыпліне "Біблейская гісторыя"

I. Вячэрнія 4-месячныя падрыхтоўчыя курсы. Заняткі праводзяцца з 22 лютага 2005 г. 1 раз у тыдзень па 3 акадэмічныя гадзіны.

Камплектнасць груп — 8 чалавек, кошт курса — 300 тыс. руб.

Камплектнасць груп — 25 чалавек, кошт курса — 115 тыс. руб.

II. Дзённыя падрыхтоўчыя курсы. Камплектнасць груп — 25 чалавек, працягласць навучання 23 вучэбныя дні. Частата правядзення заняткаў — 1 раз у дзень па 4 акадэмічныя гадзіны. Кошт курса — 200 тыс. руб. Пачатак навучання з 15 чэрвеня па 15 ліпеня (штодзённа, акрамя выхадных).

III. Завочныя падрыхтоўчыя курсы. Слухачы атрымліваюць метадычную літаратуру і 8 кантрольных заданняў, якія рэцэнзуе выкладчык. Кошт курса — 85 тыс. руб. Прыём заяваў з 1 лютага 2005 г.

Даведкі па тэлефоне 289-11-61 (інстытут тэалогіі).

Адрас факультэта дауніверсітэцкай адукацыі: г. Мінск, вул. Кастрычніцкая, 4, пакоі 203, 205, 207.

Кантактныя тэлефоны факультэта: 209-52-85, 227-75-37.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

11 лютага 2005 года. № 3 (1911)

КНІЖНАЯ ПАЛІЦА

ВЫДАДЗЕНА Ў БДУ

У мінулым 2004 годзе ўпраўленнем рэдакцыйна-выдавецкай работы падрыхтавана да друку 352 кнігі і брашуры агульным аб'ёмам 2892,82 улікова-выдавецкага аркуша. З гэтай колькасці пабачылі свет 223 кнігі і брашуры (1721,44 ул.-выд. арк.), а 129 (1171,38 ул.-выд. арк.) знаходзяцца ў друкарні РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ". 16 навучальных дапаможнікаў выдадзена з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі XVI—XVIII ст. Хрэстаматыя. *Пад рэдакцыяй Т.І. Доўнар.* У выданні змешчаны матэрыялы па гісторыка-прававой спадчыне беларускага народа, а таксама вытрымкі з твораў беларускіх мыслінедяў.

П.В. Терешкович. **Этническая история Беларуси XIX — начала XX в.: В контексте Центрально-Восточной Европы.** Манаграфія на аснове параўнаўчага аналізу народаў рэгіёну Цэнтральна-Усходняй Еўропы разглядае спецыфіку этнічнай гісторыі Беларусі XIX — пачатку XX ст.

Т.М. Дасаева. **Максім Гарэцкі і Янка Брыль: Тыпалогія малых жанраў.** У манаграфіі праводзіцца параўнальна-тыпалагічнае даследаванне эпічных жанраў у творчасці М. Гарэцкага і Я. Брыля.

А.В.Гарпик, Г.И. Шевченко. **Латинский язык = Lingua Latina.** Навучальны дапаможнік складаецца з граматыкі (марфалогія і сінтаксіс), практычнай часткі і хрэстаматыі арыгінальных тэкстаў класічных рымскіх і позналацінскіх аўтараў. У лік лацінскіх тэкстаў увайшлі грамата, дадзеная каралём Францішку Скарыну, урыўкі з «Песні пра зубра» Мікалая Гусоўскага, «Прусакі вайны» Яна Вісліцкага.

Б.П. Власов. **Антропогенная трансформация озер Беларуси: геоэкологическое состояние, изменения и прогноз.** У выданні разглядаюцца пытанні развіцця і эвалюцыі азёрных экасістэм, вывучаецца і аналіз азёрнага фонду краіны, даецца характарыстыка і аналіз прыродных рэсурсаў азёр і іх гаспадарчага выкарыстання.

Т.С. Студенко. **Эстетика импрессионизма в творчестве Э. Золя.** У манаграфіі аналізуецца роля і характар імпрэсіяністычных прыёмаў і сродкаў у мастацкай сістэме Эміля Заля.

В.В. Долгий, И.А. Шалатонин. **Программирование микропроцессорных систем: Практикум.** У выданні выкладаюцца асновы функцыянавання мікрапрацэсараў, прынцыпы праграмірования з выкарыстаннем навыкаў па іх ужыванні ва ўласных напрацоўках.

В.И. Лобач, В.П. Кирлица, В.И. Малюгин, С.И. Сталевская. **Имитационное и статистическое моделирование: Практикум.** У кнізе падаюцца асноўныя метады статыстычнага мадэліравання выпадковых элементаў, метад Монтэ-Карла для вылічэння неўласных інтэгралаў і рашэння сістэм лінейных алгебраічных ураўненняў.

Т.А. Савицкая, М.И. Шиманович. **Коллоидная химия: Лабораторный практикум. Ч. 1.** У першую частку практыкуму па курсе калоіднай хіміі ўвайшлі работы на вывучэнні паверхневых з'яваў.

А.П. Змитрович, Бернар Фиоле. **Финансовый менеджмент.** У навучальным дапаможніку выкладаюцца прынцыпы кіравання фінансамі прадпрыемства.

Упраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы БДУ

СПОРТ

СПАРТАКІЯДА Ў "БРЫГАНЦІНЕ"

Фінальныя спаборніцтвы спартакіяды супрацоўнікаў Белдзяржуніверсітэта па 7 відах спорту адбыліся 5—6 лютага на базе САК "Брыганціна".

На гэтым этапе ўдзел у спартакіядзе ўзялі больш за 200 чалавек, якія прадстаўлялі 23 падраздзяленні. А ў папярэднім туры змагаліся больш за 400 выкладчыкаў. Самай моцнай аказалася каманда кафедры фізічнага выхавання і спорту.

Дзякуючы добрай арганізацыі турніра за два дні ўдзельнікі паспелі вызначыць пераможцаў на ўсіх відах спорту. І нават адбыліся нецыйныя спаборніцтвы па шахматах сярод жанчын, а таксама па лыжным спорце.

Афіцыйныя ж спаборніцтвы паказалі наступнае. Зборная ваеннага факультэта перамагла ў спаборніцтвах па армрэслінгу. Другое месца — у юркаледжа, трэцяе – у эканамічнага факультэта. "Прэзідэнтамі ў NBA" паказалі сябе выкладчыкі кафедры фізічнага выхавання і спорту, якія занялі першае месца ў спаборніцтвах па баскетболе. За імі ідуць фізічны факультэт і факультэт радыёфізікі і электронікі. Каманда фізфака перамагла ў турніры па валейболе, арганізаваны ліцэй БДУ і кафедру фізвыхавання і спорту. Зборная студгарадка лепш за ўсіх гуляе ў міні-футбол. Другое месца заняла каманда кафедры фізічнага выхавання і спорту, "бронза" дасталася факультэту прыкладной матэматыкі і інфарматыкі. Найлепшыя гульцы ў настольны тэніс выявіліся на кафедры фізвыхавання і спорту (першае месца ў спаборніцтвах). Следам размясціліся УП "Унікаштмет" і факультэт радыёфізікі і электронікі. Акрамя таго, на кафедры фізвыхавання і спорту ёсць вельмі добрыя шпуўцы, якія былі найхутчэйшымі ў басейне і здабылі першае месца для сваёй каманды. Другое і трэцяе месцы — у факультэта радыёфізікі і электронікі ды ваеннага факультэта адпаведна.

А вось лагічным мысленнем могуць ганарыцца фізфакаўцы, якія перамаглі ў спаборніцтвах па шахматах, аднародзіўшы зборныя факультэтаў прыкладной матэматыкі ды радыёфізікі і электронікі.

Усе каманды, якія занялі першыя месцы, атрымалі ганаровыя граматы і кубкі пераможцаў. Акрамя таго ім дасталіся спецыяльныя прызы. А зборная кафедры фізічнага выхавання і спорту, якая перыядычна ўдзельнічала ў агульным заліку, атрымала пераходны кубак. Леней сказаць, што гэтая каманда проста не аддала яго нікому (бо з'яўляецца пераможцай мінулага сезону). Ці зможа пехта аспрэчыць чэмпіёнскае званне галоўных універсітэцкіх спартсменаў, будзе відаць праз год, на наступнай спартакіядзе.

Аляксандр САЛАМАХІН
Фотаздымкі Аляксандра СНАПКА

СВЯТЫ

14 лютага — Дзень святога Валянціна

"МОЙ ЛЁС — МАЁ КАХАННЕ"

Каханне — стрыжань-аснова для сапраўднай згуртаванай сям'і. А калі яно падмацавана гадамі сяброўства, працай у адной навучальнай установе, то такой сям'і няблага надаць ганаровае званне універсітэцкай.

Уладзімір Аляксандравіч і Людмила Арсенеўна Навумовічы знаёмы яшчэ са школьнай лаўкі, з прыемных гадоў дзяцінства. Зараз муж з жонкай разам

працуюць у БДУ. Ён дацэнт кафедры беларускай літаратуры і культуры філалагічнага факультэта, кандыдат філалагічных навук, член Саюза пісьменнікаў. Яна 27 год адпрацавала ў навукова-даследчай часці ў аддзеле патэнтна-ліцэнзійнай работы, спявае ў народным хоры выкладчыкаў і супрацоўнікаў БДУ "Родніца".

21 лютага сям'я Навумовічаў будзе святкаваць рубінавае вяселле — 40 год сумеснага жыцця. Як кажа Уладзімір Аляксандравіч, за такі доўгі адрэзак часу яго пачуцці нікольк не змяніліся: "Сёння я з тым самым пачуццём, што і ранней".

Кожная сям'я, быццам маленькая дзяржава, мае асабістую гісторыю. А пачынаецца яна заўжды з хвалюючага моманту знаёмства. У Навумовічаў было ажно некалькі такіх прыемных імгненняў.

Як ўжо згадвалася, Людмила і Уладзімір разам вучыліся ў школе. Дакладней, ён быў старэйшым на клас. Сама школка знаходзілася за 3 кіламетры ад іх вёсак, на былым панскім хутары. Вядома, узімку заўжды ўзнікалі цяжкасці: то завірухі, то адлігі. Адноўчы на такім дрэнным надвор'і хлопцы і дзяўчаты рушылі на вучобу. Ішлі яны з розных бакоў і, згубіўшы напрамак у снежнай цемры, дужа напалохаліся адзін аднаго.

— Вы хто? — запыталіся палахлівыя дзяўчаты.

— Людзі, — адказалі хлопцы. — А вы хто?

Вось такі гумарыстычны пачатак знаёмства.

Хутка надышла вясна, і вучні сталі часцей выходзіць на перапынках на двор. Агульным месцам сустрэчы была бочка з вадой для піцця. Стоячы адноўчы ў чарзе, Уладзімір заўважыў "празрыстае, звонкае дзяўчо, ажно вушы свецяцца!" Чамусьці вось гэтыя "вушы" надоўга затрымаліся ў хлопцавым сэрцы.

Потым былі вечарынкі, танцы, патаемная пошта (пошта накшталт нашых "валянцінак"), праводзіны дахаты. Час бег. Надышла пара Уладзіміру развітвацца са школай. Адзін з маладых настаўнікаў увёў сярод вучняў цікавае правіла: будучыя выпускнікі прышпільваюць да вопраткі тых, што ўжо выпусціліся, кветачкі, падобныя да вясельных. Здагадайцеся, каму чаплянла кветачку Людмила? Ці ж гэта не знак?..

"Свой першы падарунак ёй я прывёз з Сімферопаля, — успамінае Уладзімір Аляксандравіч. — Гэта была экзатычная ваза з таполенькага фарфору. Я па ёй нават сам надпіс зрабіў: "Людміле ў дзень 16-годдзя". Уявіце, правезці яе цэлай праз дзве краіны — цягніком, на машыне, парэшце, на веласіпедзе!" Яшчэ шмат разоў Уладзімір дзівіў жонку такімі незвычайнымі падарункамі. Яна ж са свайго боку з цеплынёй успамінае магнолію, якую муж сам знайшоў (а не купіў!) у Карпатах.

Як вяселле згуляем, такое жыццё і будзе. Калі верыць гэтаму, то Навумовічы павінны жыць вельмі весела. Бо дужа дзівоснае вяселле атрымалася ў іх: сярод гасцей адны жартаўлівыя студэнты (самі маладыя на той час таксама вучыліся). Некаторыя з іх, выкупляючы нявесту, забрали з сабой увесь куратнік (адбывалася ўсе ў вёсцы), а потым да канца свята не магли ачысціцца ад пер'я.

Сёння Уладзімір Аляксандравіч не стамляецца паўтараць: "Мой лёс — маё каханне". І сапраўды, выгадаваўшы дзяцей, Навумовічы зараз дапамагаюць ім гадаваць унукаў.

"Каханне — вянец часу, паказчык спеласці і сталасці душы, посьбіт змястоўнасці сэрца і паскоранасці думы чалавечай". Пражыць жыццё з каханнем жадаюць Навумовічы ўсім закаханым у свеце.

Алена КРЫЎКША
Фота з сямейнага архіва Навумовічаў

У ПАВЕТРЫ ПАНУЕ КАХАННЕ

Ігар і Вераніка пазнаёміліся ў Нецярбургскім дзяржаўным універсітэце. Ніхто нават не меркаваў, што беларускія студэнты сустрэнуцца і пакахаюць адзін аднаго ўдалечыні ад радзімы. Аднак летам 2003 года ў паўночнай сталіцы Расіі адгулялі вяселле, потым маладыя перавяліся ў БДУ на факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі. Праз год на свет з'явілася дачка Аліна.

Вераніка прызналася, што адпакуленкі звяртаюцца да яе на "Вы". Ці то павагу праяўляюць, ці проста звычка жанатых так называць.

Вось так, каханне можа нанаткаць дзе заўгодна. Дарэчы, у нашай alma mater некалькі дзесяткаў параў студэнтаў, якія пазнаёміліся пад час навучання ва універсітэце. Спадзяемся, не яны апошнія.

Сняжана ЦУРАНКОВА
Фота з сямейнага архіва

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты — БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ
Газета у пагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года
Надрукавана у РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ" 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

11 лютага 2005 года
Падпісана да друку 10.02.2005 г.
Зак. 147. Тыраж 1000 экз.
Ум. друк. арк. 1

Рэдактар Таццяна КАЗАК
Адрас рэдакцыі: 220050, Мінск, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, пакой 411, тэлефон 209-55-45
e-mail: Gazeta@bsu.by, www.gazeta.bsu.by